# КАНФЕРЭНЦЫЯ, ЯКАЯ СТАНОВІЦЦА БРЭНДАМ

У чацвёрты раз у нашым універсітэце праходзіла міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Актуальныя праблемы крыніцазнаўства», якая сабрала вядомых гісторыкаў і крыніцазнаўцаў. Сёлета яна была прымеркавана да 420-годдзя надання Віцебску магдэбургскага права.

Арганізатарамі канферэнцыі выступілі гістарычны факультэт нашай ВНУ, Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кафедра гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы, а таксама расійская Навукова-педагагічная школа крыніцазнаўства (сайт Источниковедение.ru). У рабоце навуковага форуму прынялі ўдзел даследчыкі з васьмі краін свету, у тым ліку з ЗША, Германіі, Венгрыі і Малі.

Адкрыў канферэнцыю намеснік старшыні Віцебскага гарадскога выканаўчага камітэта Пётр Падгурскі. Пётр Мікалаевіч адзначыў, што 2017 год сімвалічны для нашага горада, бо 420 гадоў таму кароль польскі і вялікі князь літоўскі Жыгімонт III Ваза даў Віцебску прывілей на магдэбургскае права. Прывілей замацоўваў правы і вольнасці мяшчан, былі створаны органы гарадскога самакіравання, пабудавана Ратуша, а Віцебск атрымаў свой унікальны герб, які амаль у нязменным выглядзе і сёння з'яўляецца сімвалам нашага горада. Пётр Падгурскі пажадаў удзельнікам канферэнцыі плённай працы і падкрэсліў, што яму заўсёды прыемна наведваць наш універсітэт, дзе ў свой час ён выкладаў на кафедры гісторыі Беларусі.

З прывітальным словам да прысутных звярнуліся вучоны сакратар Інстытута гісторыі НАН Беларусі А.П. Салаўянаў і прадстаўнік Навукова-педагагічнай школы крыніцазнаўства, доктар гістарычных навук, прафесар С.І. Малавічка.







Фота аўтара.

На пленарным і секцыйных пасяджэннях прагучалі даклады па праблемах гісторыі, тэорыі і метаду крыніцазнаўства, па пытаннях крыніцазнаўства гістарыяграфіі, архівазнаўства і археаграфіі, музейнага крыніцазнаўства, а таксама даклады пра крыніцы гісторыі розных краін і перыядаў. Адметнасцю сёлетняга форуму стала вылучэнне асобнай секцыі «Гістарычная ўрбаністыка. Крыніцы гісторыі гарадоў».

«Я задаволены тым, як прайшла канферэнцыя, – адзначыў адзін з арганізатараў – загадчык кафедры гісторыі Беларусі нашай ВНУ, кандыдат гістарычных навук, дацэнт А.М. Дулаў. – Наш універсітэт у чарговы раз стаў пляцоўкай для камунікацыі гісторыкаў. Не памылюся, калі скажу, што навуковы форум «Актуальныя праблемы крыніцазнаўства» становіцца брэндам кафедры, факультэта і нашай альма-матар. Пра гэта сведчыць, напрыклад, геаграфія яго ўдзельнікаў. Сярод іх – як навукоўцы, якія традыцыйна прымаюць удзел у канферэнцыі, так і тыя, хто прыехаў у Віцебск упершыню. Шчыра дзякую ўсім, хто аказаў дапамогу ў арганізацыі і правядзенні навуковага форуму».

Удзельнікі канферэнцыі атрымалі зборнікі матэрыялаў і сувенірную прадукцыю, а таксама наведалі музей-сядзібу І.Я. Рэпіна «Здраўнёва».

**Алеся ДУБРОЎСКАЯ.**